*Спецыяльны выпуск газеты для абітурыентаў*

# НА ВУЧОБУ ЗАПРАШАЕ ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі Універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 18 (618) | Субота, 24 мая 1986 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

● СЁЛЕТА ВА УНІВЕРСІТЭТ НА ДЗЁННАЕ АДДЗЯЛЕННЕ БУДЗЕ ПРЫНЯТА 700 ПЕРШАКУРСНІКАЎ, НА ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ — 475.

● У ГДУ СТУДЭНТЫ НАБЫВАЮЦЬ ВЕДЫ ПА 11 СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ.

● НА 43 КАФЕДРАХ УНІВЕРСІТЭТА ПРАЦУЕ 415 ВЫКЛАДЧЫКАЎ. СЯРОД ІХ — АКАДЭМІК АН БССР, ЧЛЕН-КАРЭСПАНДЭНТ АН БССР, ЧЛЕН-КАРЭСПАНДЭНТ АПН СССР, 17 ДАКТАРОЎ, ПРАФЕСАРАЎ І 213 КАНДЫДАТАЎ НАВУК, ДАЦЭНТАЎ.

● ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ — ЧАТЫРЫ ВУЧЭБНЫЯ КАРПУСЫ І СТОЛЬКІ Ж ІНТЭРНАТАЎ, ЕСЦЬ САНАТОРЫЙ-ПРАФІЛАКТОРЫЙ.

● БІБЛІЯТЭКА ГДУ — АДНА З БУЙНЕЙШЫХ У ВОБЛАСЦІ.

● З МІНУЛАГА ГОДА ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ НА МАТЭМАТЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ ВУЧЫЦЦА МОЛАДЗЬ ЗАМЕЖНЫХ КРАІН.

● СЁЛЕТА ПАЧЫНАЕЦЦА БУДАЎНІЦТВА ШМАТПАВЯРХОВАГА КОРПУСА ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА. ЗДАЦЬ ЯГО Ў ЭКСПЛУАТАЦЫЮ ПРАДУГЛЕДЖВАЕЦЦА Ў НАСТУПНЫМ ГОДЗЕ.

● ЗВОДНЫ СТУДЭНЦКІ АТРАД ГДУ — НЕАДНАРАЗОВЫ ПЕРАМОЖЦА АБЛАСНОГА І РЭСПУБЛІКАНСКАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА.

## ПРАВІЛЫ ЗМЯНІЛІСЯ, ПАТРАБАВАННІ ЎЗРАСЛІ

**Б. В. БОКУЦЬ,**
**рэктар ГДУ, старшыня прыёмнай камісіі, акадэмік АН БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.**

Праз тыдзень у агульнаадукацыйных школах пачнуцца выпускныя экзамены. Гэта апошняе выпрабаванне для тых, хто стаіць на парозе самастойнага жыцця. Ужо цяпер вельмі важна выбраць у ім правільную дарогу, каб не збочыць з яе. Тут маецца на ўвазе выбраць любімую прафесію, ніколі не расчаравацца ў ёй і на працягу ўсёй сваёй працоўнай дзейнасці прыносіць найбольшую карысць Радзіме.

Штогод вялікая колькасць юнакоў у і дзяўчат з атэстатамі сталасці, маладых людзей з пэўным вопытам і жыццёвай загартоўкай марыць паступіць на вучобу ў Гомельскі дзяржаўны універсітэт. Гэта зусім заканамерна: ГДУ — вядучая вышэйшая навучальная ўстанова Беларускага Палесся. За 17 гадоў свайго існавання ён стаў буйным навучальным, навуковым і культурным цэнтрам рэспублікі, сапраўднай кузняй па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў для многіх галін народнай гаспадаркі. Стацыянарна і без адрыву ад вытворчасці тут атрымалі вышэйшую адукацыю прыкладна 18 тысяч 300 чалавек. Звыш 1.100 выпускнікоў дзённага аддзялення і завочнага факультэта атрымаюць дыпломы ГДУ сёлета.

Як вядома, перад савецкай вышэйшай школай новыя і вельмі адказныя задачы пастаўлены XXVII з'ездам КПСС. Яны прадугледжваюць карэннае паляпшэнне падрыхтоўкі маладых спецыялістаў з улікам заказаў на іх прадпрыемстваў і арганізацый, далейшае больш інтэнсіўнае развіццё вузаўскай навукі з хутчэйшым укараненнем яе вынікаў у практыку. У адпаведнасці з гэтымі патрабаваннямі пройдзе істотная перабудова вышэйшай школы, якая закране ўсе яе звенні. Першым важным этапам сталі змяненні, унесеныя ў правілы прыёму студэнтаў. Яны дазволяць больш гібка адбіраць для вучобы кантынгент добра сарыентаваных да прафесіі маладых людзей, паўней выкарыстоўваць прадстаўляемыя льготы для адпаведных катэгорый абітурыентаў.

Ажыццяўленне рашэнняў партыі аб вышэйшай школе — наш важнейшы клопат. Сваёй першачарговай мэтай мы лічым няўхільнае павышэнне якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў на аснове шырокага ўкаранення ў вучэбны працэс вылічальнай тэхнікі, далучэння студэнтаў з першых гадоў навучання да плённай навукова-даследчай працы, актыўнага грамадскага жыцця. Паспяховаму вырашэнню гэтай задачы садзейнічае дастаткова высокі навуковы патэнцыял універсітэта. Цяпер на 43 яго кафедрах працуе 415 высокакваліфікаваных выкладчыкаў. Сярод іх — 17 дактароў, прафесараў і 213 кандыдатаў навук, дацэнтаў. Толькі за мінулую пяцігодку атрад вучоных універсітэта папоўніўся 3 доктарамі і 68 кандыдатамі навук. Нельга не заначыць, што ў пераважнай большасці — гэта выпускнікі ГДУ і яго аспірантуры.

Перад нашым універсітэтам у новай пяцігодцы — шырокія гарызонты. Прадугледжваецца адкрываць новыя спецыяльнасці, спецыялізацыі, навукова-даследчыя падраздзяленні. Ужо сёлета на геалагічным факультэце адбудзецца першы набор на новую, на нашу думку, вельмі важную спецыяльнасць: «Геафізічныя метады пошукаў і разведкі радовішчаў карысных выкапняў». Кафедры і факультэты прадоўжаць работу па абгрунтаванню адкрыцця новых спецыяльнасцей, далейшаму ўмацаванню ўзаемавыгадных сувязей з вядучымі прамысловымі прадпрыемствамі, арганізацыямі і ўстановамі.

У нашым універсітэце няўхільна паляпшаюцца матэрыяльна-тэхнічная база, жыллёвыя, бытавыя і іншыя ўмовы, ствараемыя для паспяховай вучобы ўсіх студэнтаў. Сёлета пачынаецца будаўніцтва яшчэ аднаго вучэбнага корпуса — для фізічнага факультэта. З увядзеннем яго ў эксплуатацыю значна пашырацца вытворчыя плошчы, што дазволіць палепшыць не толькі аўдыторны фонд, але і павялічыць колькасць неабходных навукова-даследчых лабараторый, аснасціць іх навейшымі прыборамі і абсталяваннем.

Як вядома, з сёлетняга года абітурыенты вышэйшых навучальных устаноў здаюць тры ўступныя экзамены. Уведзена субяседаванне, пасля якога могуць быць налічаны дадатковыя балы. Апошняе, бадай, больш за ўсё цікавіць і хвалюе абітурыентаў. Павінен сказаць, што субяседаванне будзе праходзіць аб'ектыўна, у поўнай адпаведнасці з устаноўленым Мінвузам СССР парадкам. У састаў камісій па кожнай спецыяльнасці ўключаны найбольш сумленныя, ведаючыя, прынцыповыя і разам з тым добразычлівыя таварышы. Яны не дапусцяць ні прадузятасці, ні паблажлівасці. Колькі дадатковых балаў заслугоўваеш, столькі і атрымаеш.

Няяўка абітурыента на субяседаванне не выключае магчымасці паступіць ва універсітэт. У такім выпадку трэба з найлепшага боку праявіць сябе на ўступных экзаменах.

На першы курс новага навучальнага года — стартавага года XII пяцігодкі універсітэт па выніках конкурснага адбору прыме 700 юнакоў і дзяўчат. Мы цвёрда перакана765, што гэта будуць самыя дастойныя, хто сваёй добрай, выдатнай вучобай, актыўным удзелам у шматгранным жыцці універсітэта працягне і памножыць яго лепшыя традыцыі.

## НАБЫВАЙЦЕ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

### НА ДЗЁННЫМ АДДЗЯЛЕННІ

1. Беларуская і руская мова і літаратура.
2. Руская мова і літаратура.
3. Гісторыя.
4. Матэматыка.
5. Фізіка.
6. Біялогія.
7. Гідрагеалогія і інжынерная геалогія.
8. Геафізічныя метады пошукаў і разведкі радовішчаў карысных выкапняў.
9. Эканоміка працы.
10. Арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.
11. Фізічнае выхаванне.

### НА ЗАВОЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

1. Беларуская і руская мова і літаратура.
2. Руская мова і літаратура.
3. Гісторыя.
4. Матэматыка.
5. Эканоміка працы.
5. Арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.
7. Біялогія.
8. Фізічнае выхаванне.







НА ЗДЫМКАХ (злева направа): 1. Галоўны корпус універсітэта. Тут размешчаны адміністрацыйныя службы і грамадскія арганізацыі, эканамічны факультэт і навукова-даследчыя лабараторыі фізічнага факультэта. 2. Студэнцкі інтэрнат кватэрнага тыпу. У гэтым будынку таксама медпункт, студэнцкі санаторый-прафілакторый, бібліятэка гісторыка-філалагічнага факультэта, кнігарня. 3. Вучэбны корпус № 1, дзе знаходзяцца гісторыка-філалагічны і біялагічны факультэты і факультэт фізвыхавання. Тут жа на другім паверсе працуе прыёмная камісія.

Фота Н. Кір'янавай.

# ВЫБІРАЙЦЕ ЛЮБУЮ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ!

## МАТЭМАТЫЧНЫ



Ажыццяўляючы гістарычныя рашэнні XXVII з'езда КПСС, выконваючы пастановы партыі і ўрада па вышэйшай школе, дэканат, партбюро, прафбюро, камітэт камсамольскай арганізацыі матэматычнага факультэта пастаянна клапоцяцца аб паляпшэнні вучэбна-выхаваўчага працэсу, фарміраванні ў будучых спецыялістаў актыўнай грамадскай пазіцыі, выпрацоўкі ў іх якасцей умелага кіраўніка вытворчасці. Вучэбны працэс на факультэце ажыццяўляюць 53 выкладчыкі, з іх — член-карэспандэнт АН БССР, член-карэспандэнт АПН СССР, 3 доктары навук, прафесары, 26 кандыдатаў навук, дацэнтаў. За час свайго існавання матфак падрыхтаваў сотні высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія выдатна працуюць у вытворчых і педагагічных калектывах. Нам прыемна, што ўсюды, дзе знаходзяцца нашы былыя студэнты, яны з гонарам трымаюць марку роднага факультэта буйнейшай ВНУ Беларускага Палесся.

Сёння практычна няма такой галіны ў сацыялістычнай вытворчасці, дзе б не прымянялася матэматыка. Значэнне гэтай навукі неперааценнае ў біялогіі, хіміі, псіхалогіі, эканоміцы, геалогіі, лінгвістыцы, фізіцы. З дапамогай матэматычных метадаў і вылічальных машын разлічваюцца канструкцыі і траекторыі палётаў касмічных караблёў, атамныя рэактары, будова хімічных рэчываў і г. д.

Матэматычным апаратам для рашэння многіх задач з'яўляюцца алгебра, тэорыя функцый, тэорыя імавернасцей, матэматычная логіка, тэорыя дыферэнцыяльных ураўненняў, функцыянальны аналіз.

Падрыхтоўка спецыялістаў на матэматычным факультэце вядзецца па спецыяльнасці матэматыка. Вучэбны план факультэта прадугледжвае вывучэнне грамадскіх навук, вялікага цыклу матэматычных і фізічных дысцыплін і адну з наступных спецыялізацый: алгебра і тэорыя лічбаў, дыферэнцыяльныя ўраўненні і іх дадаткі, вылічальная матэматыка, тэорыя імавернасцей і матэматычная статыстыка, матэматычнае забеспячэнне ЭВМ, прымяненне сродкаў вылічальнай тэхнікі. Вучэбны план складзен такім чынам, што за першыя два гады студэнты атрымліваюць агульную фундаментальную падрыхтоўку, а з трэцяга курса размяркоўваюцца па кафедрах для больш поўнага і паглыбленага вывучэння адной са спецыялізацый.

Выпускнікі факультэта накіроўваюцца на работу выкладчыкамі ВНУ, тэхнікумаў, сярэдніх школ, ПТВ і г. д.

На факультэце існуюць наступныя кафедры: алгебры і геаметрыі, матэматычных праблем кіравання, дыферэнцыяльных ураўненняў, вылічальнай матэматыкі і праграміравання, матэматычнага аналізу, тэорыі імавернасці і матэматычнай статыстыкі.

Прафесарска - выкладчыцкі састаў факультэта зацікаўлен, каб на матфак паступала здольная, таленавітая моладзь. З гэтай мэтай праводзіцца абласная матэматычная алімпіяда. Гэта дазваляе выявіць сярод выпускнікоў школ тых рабят, якія па-сапраўднаму цікавяцца матэматыкай. Будучым абітурыентам карысна будзе пазнаёміцца з дапаможнікам нашых выкладчыкаў А. Н. Бекарэвіча і М. В. Селькіна «Падрыхтоўка вучняў сярэдніх школ да здачы ўступных экзаменаў у ГДУ па матэматыцы».

Студэнты нашага факультэта прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце. Іх даследаванні дасылаюцца на рэспубліканскія, усесаюзныя конкурсы, дзе неаднаразова адзначаліся высокімі катэгорыямі і прэміямі.

На нашым факультэце створаны ўсе ўмовы для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Тыя, хто жадае больш блізка пазнаёміцца з матфакам, могуць зрабіць гэта ў «Дні матэматычнага факультэта», якія праводзяцца штогод у першай дэкадзе красавіка.

**У. ФІЛІПЦОЎ,**
**дэкан факультэта, дацэнт.**

## ГЕАЛАГІЧНЫ



Геалогія з'яўляецца навукай аб будове і гісторыі зямной кары і нашай планеты ў цэлым. Людзі, якія набываюць прафесію геолага, вырашаюць задачы народнай гаспадаркі, звязаныя з комплексным выкарыстаннем прыродных рэсурсаў, выяўленнем і распрацоўкай новых месцанараджэнняў карысных выкапняў і забеспячэннем сыравінай нашай прамысловасці.

Геалагічны факультэт ГДУ рыхтуе кадры па спецыяльнасцях «Гідрагеалогія і інжынерная геалогія», «геафізічныя метады пошукаў і разведкі радовішчаў карысных выкапняў».

Усе студэнты атрымліваюць агульнаадукацыйную падрыхтоўку па грамадскіх навуках, матэматыцы, фізіцы, хіміі, замежнай мове і інш. Адначасова яны вывучаюць асноўныя геалагічныя дысцыпліны — агульную геалогію, гістарычную геалогію, геалогію СССР, геакартаванне, гідрагеалогію, інжынерную геалогію, мінералогію, геахімію, крышталеграфію, мерзлатазнаўства, карысныя выкапні, дынаміку падземных вод, сейсмаразведку, электраразведку, магнітаразведку, прамысловую геафізіку, гравіразведку.

На факультэце дзейнічаюць 23 лабараторыі і кабінеты, мінералагічны музей. Вучэбны працэс ажыццяўляюць 2 доктары геолага-мінералагічных навук, прафесары, 14 кандыдатаў навук, дацэнтаў, 5 выкладчыкаў.

У вучэбнай рабоце таксама прымаюць удзел 12 супрацоўнікаў навукова-даследчага сектара, галіновай лабараторыі і сейсмалагічнага пункта.

Тыя, хто заканчвае наш факультэт па спецыяльнасці «гідрагеалогія і інжынерная геалогія», з'яўляюцца геолагамі шырокага профілю і вырашаюць задачы, звязаныя з геолага-пошукавымі работамі па выяўленню месцанараджэнняў прэсных піцявых і прамысловых вод, разведкі месцанараджэнняў руд і будаўнічых матэрыялаў, геалагічнай здымкі, водазабеспячэннем населеных пунктаў, вывучэннем мінеральных лекавых і прамысловых вод, рэжымнымі назіраннямі за воданоснымі гарызонтамі і дзеючымі водазаборамі, змяненнямі пад уздзеяннем гаспадарчай дзейнасці чалавека (буйнае інжынернае будаўніцтва, распрацоўка месцанараджэнняў, пракладка дарог, мастоў, меліярацыйныя работы і г. д.), даюць заключэнні для абгрунтавання праектаў і ўзвядзення розных збудаванняў. Тыя, хто заканчвае факультэт па спецыяльнасці «геафізічныя метады пошукаў і разведкі радовішчаў карысных выкапняў», рашаюць задачы геалогіі і гідрагеалогіі геафізічнымі метадамі. Любая буравая свідравіна закладваецца па даных геафізікі. Вызначэнне геалагічнай будовы зямной кары, граніц пройдзеных свідравінай парод, фізічных уласцівасцей парод, тэхнічных параметраў свідравіны таксама праводзіцца геафізічнымі метадамі.

Шлях на геалагічны факультэт праходзіць праз школу «Юнага геолага» або проста па сцяжынцы рамантыкі, развітай кнігамі, назіраннямі, расказамі геолагаў. Студэнты факультэта пасля 1 і 2 курса праходзяць вучэбную, 3 і 4 — вытворчую практыку працягласцю 2—3 месяцы. Вучэбныя практыкі праводзяцца на тэрыторыі Беларусі і Украіны, вытворчыя — у Беларусі, Горкаўскай, Ульянаўскай і Валгаградскай абласцях, Чыцінскай і Іркуцкай абласцях, на Камчатцы, Чукотцы, Сахаліне, у іншых раёнах нашай краіны.

Вучоба на факультэце базіруецца на грунтоўнай падрыхтоўцы па матэматыцы і фізіцы. Памылковая шырока распаўсюджаная думка аб тым, што геолагу не патрэбна ведаць фізіку і матэматыку. Вывучэнне спецкурсаў па геафізічных метадах, дынаміцы падземных вод, інжынерных і гідрагеалагічных разліках, мадэляванню гідрагеалагічных працэсаў заснавана на глыбокім веданні дыферэнцыяльнага і інтэгральнага вылічэнняў, а апрацоўка матэрыялаў даследаванняў патрабуе прымянення вылічальных метадаў матэматыкі. Павышэнне прадукцыйнасці працы і паляпшэнне якасці геалагічных работ праклалішлях шырокаму ўкараненню ў геалогію геафізічных метадаў даследаванняў, якія патрабуюць добрага ведання фізікі. Вывучэнне розных геалагічных з'яў, утварэння парод, мінералаў, карысных выкапняў засноўваецца на цячэнні фізіка-хімічных працэсаў і патрабуе ведаў фізікі і хіміі.

Спецыяльнасць геолага не толькі рамантычная, але і заўсёды абнаўляючаяся. Раней геолага ўяўлялі толькі з геалагічным малатком, цяпер жа на яго ўзбраенні — навейшыя геафізічныя прыборы і вылічальныя цэнтры. Шырока асвойваюцца пошукі карысных выкапняў у марскіх акваторыях, пастаянна павялічваецца аб'ём даследаванняў, даследуецца геалагічная будова Антарктыды, акваторый акіянаў, геалагічная будова Месяца, Венеры, Марса.

Факультэт мае тры кафедры: гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі, мінералогіі і агульнай геалогіі, геафізікі. Вядуцца навукова-даследчыя работы ў рамках цеснага супрацоўніцтва з Інстытутам геахіміі і геафізікі АН БССР, Упраўленнем геалогіі СМ БССР і іншымі арганізацыямі. Ва ўсіх навукова-даследчых работах актыўны ўдзел прымаюць студэнты.

Выпускнікі геафака накіроўваюцца на працу ў арганізацыі Міністэрстваў геалогіі, нафтавай прамысловасці, воднай гаспадаркі, меліярацыі зямель, будаўніцтва, у розныя навукова-даследчыя ўстановы ўсёй нашай краіны.

**А. ПІНЧУК,**
**дэкан факультэта, дацэнт.**

## БІЯЛАГІЧНЫ



Ва універсітэце біялагічны факультэт з'яўляецца адным са старэйшых.

Дзейнасць факультэта цесна звязана з жыццём нашай вобласці, рэспублікі, краіны ў цэлым. Рашэнне Харчовай праграмы, ахова акаляючага асяроддзя — важнейшыя праблемы сучаснасці, вызначаныя XXVII з'ездам КПСС на бягучую пяцігодку. І наш факультэт павінен уносіць пасільны ўклад у рашэнне гэтых праблем. Падрыхтоўка спецыялістаў-біёлагаў на факультэце, выкананне навукова-даследчай работы цесна звязаны з рашэннем пастаўленых партыяй задач.

Біялагічны факультэт ГДУ рыхтуе спецыялістаў біялагічнага профілю з правам выкладання біялогіі і хіміі ў сярэдніх школах, тэхнікумах, сярэдніх спецыяльных вучылішчах. Выпускнікі-выдатнікі факультэта атрымліваюць рэкамендацыі для паступлення ў аспірантуру. Многія з іх закончылі аспірантуру і працуюць выкладчыкамі ВНУ і супрацоўнікамі НДІ. Студэнты біяфака спецыялізуюцца па батаніцы і заалогіі — для сярэдняй школы; фізіялогіі чалавека і жывёлін з дэталёвым вывучэннем фізіялогіі і біяхіміі жывёлін і аналізу якасці кармоў — для лабараторый біяхімічнага профілю.

Вучэбны працэс на факультэце цесна звязан з навукова-даследчай работай. З першага курса студэнты прымаюць у ёй самы актыўны ўдзел. Па матэрыялах навуковых даследаванняў яны пішуць курсавыя і дыпломныя работы, рыхтуюць даклады для студэнцкіх навуковых канферэнцый, удзельнічаюць у рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах на лепшую студэнцкую работу.

На кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін праводзяцца даследаванні нервова-гумаральных механізмаў рэгуляцыі функцый у норме і паталогіі. Тэма кафедры ўключана ў рэспубліканскую праграму, каардынуемую Інстытутам фізіялогіі АН БССР.

У плане рашэння пытанняў па рацыянальнаму выкарыстанню і ахове жывёльнага свету кафедра заалогіі і аховы прыроды выконвае тэму: «Распрацоўка прынцыпаў і метадаў аховы, рэканструкцыі і рацыянальнага выкарыстання жывёльнага свету Палесся (Гомельскай і Брэсцкай абласцей)».

Вялікае значэнне ў падрыхтоўцы маладых спецыялістаў-біёлагаў маюць вучэбныя і вытворчыя практыкі. Студэнты праходзяць іх на біястанцыі «Старыя Чонкі», у экспедыцыях і філіялах інстытута «Белгіпразем», лабараторыях жывёлагадоўчых комплексаў, калгасах і саўгасах Гомельскай вобласці, у сярэдніх школах.

Сур'ёзная ўвага на факультэце ўдзяляецца каардынацыі навукова-даследчай работы з АН СССР і АН БССР і далейшаму ўкараненню ў вытворчасць вынікаў даследаванняў.

Вучэбна-выхаваўчы працэс і навукова-даследчую работу на факультэце ажыццяўляюць 35 выкладчыкаў, у тым ліку 2 доктары навук, прафесары і 24 кандыдаты навук, дацэнты.

У састаў факультэта ўваходзяць 4 кафедры: батанікі і фізіялогіі раслін, заалогіі і аховы прыроды, фізіялогіі чалавека і жывёлін, хіміі.

Студэнты нашага факультэта прымаюць актыўны ўдзел у будаўнічым руху, мастацкай самадзейнасці, сябруюць са спартам. У саставе Дружыны па ахове прыроды студэнты факультэта выступаюць з дакладамі і гутаркамі перад вучнямі школ, навучэнцамі прафтэхвучылішчаў, арганізуюць работу па выяўленню браканьерства.

Сардэчна запрашаем выпускнікоў сярэдніх школ на наш факультэт. Вялікіх вам поспеху!

**С. АЛЕШКА,**
**дэкан факультэта, дацэнт.**

